# «Віват, талент»

***Для Канцэртнага аркестра духавых і ўдарных інструментаў «Светач» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў 21 снежня запомніцца не толькі крахам усіх прадказанняў пра канец света, але і прыгожай перамогаю на Міжнародным конкурсе выканальніцкага майстэрства «Віват, талент» у Санкт-Пецярбургу.***

Мерапрыемства прайшло ў рамках адной з цэнтральных пераднавагодніх падзеяў культурнага жыцця Паўночнай сталіцы – Каляднай Асамблеі. Яго арганізатарамі сталі творчы цэнтр «Натхненне» сумесна з Камітэтамі па культуры і адукацыі Санкт-Пецярбурга і Ленінградскай вобласці і Заканадаўчым сходам Санкт-Пецярбурга. Конкурс сабраў прафесійныя і аматарскія калектывы з розных краінаў свету, сярод якіх калектывы БДУ культуры і мастацтваў і спявак Аляксандр Мурашка.



А. Мурашка

А. Мурашка – вядомы ў Беларусі мецэнат, які, будучы прафесійным спеваком, выканаў некалькі рамансаў у суправаджэнні аркестра «Светач». Аляксандр Уладзіміравіч быў адзначаны некалькімі высокімі міжнароднымі ўзнагародамі за асабісты ўнёсак у развіццё сучаснага музычнага мастацтва, мецэнацтва па падтрымцы талентаў Беларусі і ўмацаванне міжнародных культурных сувязяў.




Капэла «Гуды»

У розных намінацыях «Светач» (мастацкі кіраўнік Віктар Валатковіч, галоўны дырыжор Аляксандр Фёдараў) заняў першае месца, Бас-квінтэт пад кіраўніцтвам Аляксандра Карацеева – другое, капэла беларускіх народных духавых інструментаў «Гуды» пад кіраўніцтвам Ігара Мангушава – трэцяе.



Аркестр «Светач»

Незвычайна якасны ўзровень, паводле меркавання аўтарытэтнага міжнароднага журы пад старшынствам заслужанага артыста Расіі Аляксандра Шусціна, характэрны для выканання аркестра, які аднойчы ўжо ўзыходзіў на музычны алімп на Міжнародным фестывалі духавой музыкі «Сурмы» (Украіна). Паводле словаў загадчыка кафедры духавой музыкі БДУКіМ В. Валатковіча, «было высока ацэненае віртуозна выкананае аркестрам дэфіле, якое спалучае ў сабе выкананне музыкі і розных фігурных рухаў».

*«Характэрна тое, што выконвалася музыка, заснаваная на беларускім матэрыяле. Тым больш, мы правялі вялікую працу па абнаўленні рэпертуару»*, – адзначыў галоўны дырыжор аркестра, заслужаны артыст Беларусі А. Фёдараў.

Прыемна здзівілі гледачоў юныя беларускія музыкі – выхаванцы прафесара БДУКіМ А. Карацеева і выкладчыка Дзіцячай школы мастацтваў № 19 Мінска Ганны Белан, якая выступіла не толькі ў якасці канцэртмайстра, але і выканала на фартэпіяна некалькі джазавых кампазіцыяў беларускіх і замежных аўтараў.

***Віншуем артыстаў і жадаем ім новых перамогаў у 2013 годзе!***

*Павел* **САПОЦЬКА,**
*фота аўтара*